**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 8 красавіка 1999 года, чацвер, № 7 (1799)

*МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА*

## АДЗІН ДЗЕНЬ У ВІЛЬНЮСЕ

Рабочая праграма супрацоўніцтва паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Вільнюскім універсітэтам, якая была падпісана ў студзені, 31 сакавіка атрымала сваё развіццё. На гэты раз у Вільнюс накіравалася дэлегацыя Белдзяржуніверсітэта на чале з першым прарэктарам прафесарам Пятром Іванавічам Брыгадзіным.

Візіт прадстаўнікоў факультэтаў і грамадскіх арганізацый БДУ — не проста даніна ветлівасці. Непасрэднае знаёмства з літоўскімі ўдзельнікамі сумеснага праекта павінна паспрыяць у выкананні падпісанага плана навуковага і культурнага супрацоўніцтва паміж універсітэтамі на 1999-2000 гады, які прадугледжвае распрацоўку шэрага навуковых тэм па гісторыі, гісторыі міжнародных адносін, праве, матэматыцы, філасофіі, біялогіі і іншых дысцыплінах. Вось чаму адзін дзень, адведзены на сустрэчы з літоўскімі калегамі, для начальніка вучэбна-метадычнага ўпраўлення дацэнта Віктара Васільевіча Самахвала, дэкана юрыдычнага факультэта дацэнта Валерыя Мікалаевіча Гадунова, намесніка дэкана факультэта міжнародных адносін дацэнта Людмілы Міхайлаўны Хухлындзінай, дэкана гістарычнага факультэта дацэнта Алега Антонавіча Яноўскага, а таксама загадчыка лабараторыі экалогіі ландшафтаў геаграфічнага факультэта дацэнта Валянціна Мінавіча Яцухно і старшыні студэнцкага савета стараст універсітэта Андрэя Сакольніка, якія ўвайшлі ў склад дэлегацыі, выдаўся надзвычай насычаным.

*ВЫ ЧУЛІ?*

## ВЯСНА – ЧАС АЛІМПІЯД

Вясна — не толькі час кахання. Для вучняў школ, ліцэяў, гімназій вясна асацыіруецца яшчэ і з рэспубліканскімі прадметнымі алімпіядамі.

Вучні ліцэя Белдзяржуніверсітэта на апошняй рэспубліканскай алімпіядзе атрымалі 60 дыпломаў розных ступеняў і 18 станоўчых водгукаў. Розніца ў тым, што дыплом даецца ўдзельніку, які заняў 1, 2 ці 3-е месца, а станоўчы водгук прысуджаецца за арыгінальнасць мыслення і вялікую колькасць набраных балаў у дакладных навуках.

Дыпломы першай ступені атрымалі

*па фізіцы:* Андрэй АЎСЯЕВІЧ, Аляксей ДАБРЫЯН, Леанід КЛІМОВІЧ, Дзмітрый ШЫРОКІ, Андрэй МАЛАШЭВІЧ;

*па біялогіі:* Сяргей ПРЫХОЖЫ, Кастусь КАТЛІНСКІ;

*па хіміі:* Юрась ГАЛАЎКО;

*па матэматыцы:* Алесь ІСНІЧ, Павел ПАГОНЫШАЎ, Алесь КІРКОЎСКІ, Дзмітрый ДОДЗЯЧЫН, Іван ЛОСЕЎ, Яўген КУЦУК;

*па рускай мове:* Надзея ГАРМЯНОВІЧ, Аляксандра КІРПІЧАВА, Марына НІКУЛІЧ;

*па гісторыі:* Віктар КАХНОВІЧ, Вольга ЯРАШ, Антось ЧАХЛОЎ, Святлана СЕНДЭР, Павел МАРОЗАЎ.

Сярод пераможцаў ёсць вучні, якія пацвердзілі свае мінулагоднія званні. А ёсць і тыя, хто дасягнуў поспехаў за час навучання ў ліцэі.

Нельга не адзначыць і навучэнцаў, якія ўдзельнічалі ў алімпіядзе па замежнай мове. Справа ў тым, што па гэтым прадмеце, які не з'яўляецца ў ліцэі профільным, два ўдзельнікі атрымалі дыплом другой ступені і станоўчы водгук.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

*А Ў ВАС? А Ў НАС!*

## ПЕРАХОДНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў БЕЛАРУСІ І ІСПАНІІ

У канцы сакавіка ва універсітэце прайшоў міжнародны навуковы семінар "Параўнальны аналіз пераходных працэсаў у Беларусі і Іспаніі".

Сустрэчу навукоўцаў адкрыў уступным словам дэкан факультэта міжнародных адносін прафесар А.В. Шарапа. З дакладамі аб палітычных працэсах у Іспаніі ў пераходны перыяд і ролі ЕС у працэсе пераходу да дэмакратыі ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы выступалі госці: прафесар Гранадскага універсітэта Хуан Мантабес, які ўзначальвае дэпартамент палітычных навук, і прафесар Гранадскага універсітэта Карлас дэ Куэта Нагуэрас.

Абмяркоўваліся таксама праблемы палітычнага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь, знешняй палітыкі незалежнай Беларусі, дзяржаўнага кіравання ў Беларусі. Даклады на гэтыя і іншыя тэмы былі падрыхтаваны навукоўцамі Белдзяржуніверсітэта: загадчыкам кафедры паліталогіі БДУ прафесарам С.В. Рашэтнікавым, прафесарам кафедры міжнародных адносін У.Я. Снапкоўскім, дацэнтам факультэта міжнародных адносін Л.М. Хухлындзінай, дацэнтам юрыдычнага факультэта С.А. Балашэнкам.

У семінары прымалі таксама ўдзел аспіранты і студэнты факультэта міжнародных адносін.

*І ЖАРТАМ І ЎСУР'ЁЗ*

## СПАБОРНІЦТВА Ў ВЕСЯЛОСЦІ І ЗНАХОДЛІВАСЦІ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У канцы красавіка ў актавай зале галоўнага корпуса Белдзяржуніверсітэта прайшлі гульні КВЗ 1/8 фінала.

Наогул гульні былі вельмі цікавымі. Каму пашчасціла трапіць на іх — атрымалі вялікае задавальненне. З'явіліся новыя цікавыя каманды. У клубе упершыню за ўсю яго гісторыю гуляла цалкам жаночая каманда. Дзяўчаты з ФПМ-2 зачаравалі ўсіх сваёй інтэлігентнасцю і энергічнасцю.

Вялікаму журы, куды ўвайшлі Уладзімір Макарэвіч (кіраўнік дырэкцыі па справах культуры БДУ), Аксана Чупрына (загадчыца аддзела культуры), ігракі каманды КВЗ БДУ Наталля Іванова і Мікалай Анішчанка, Аляксей Багамолаў (старшыня Студэнцкага саюза БДУ), Алесь Радзівілаў (арт-клуб "Рэактар"), было няпроста выбраць 8 каманд, якія працягнуць барацьбу ў 1/4 фінала. У першы дзень гульняў перамаглі каманда Брэсцкага медыцынскага універсітэта "Аддзел кадраў", каманды факультэта радыёфізікі і электронікі, геаграфічнага факультэта — геафак-2, а таксама каманда ФЭФ-2.

На другі дзень перамогу святкавалі зборная каманда Віцебскага дзяржаўнага універсітэта, ФПМ-2, факультэта міжнародных адносін "2/10" і "Лева руля"(Навагрудак—Мінск).

Нагадаем, што каманды-пераможцы працягнуць спаборніцтва ў весялосці і знаходлівасці ў маі. Так што не прапусціце.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

АБ'ЯВЫ

# Рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

- **Загадчыкаў кафедраў:** дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцей, дынамічнай геалогіі, заалогіі, рускай мовы, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права;
- **Прафесара кафедры** атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі;
- **Дацэнтаў кафедраў:** фізічнай электронікі, метадаў аптымальнага кіравання, матэматычнай фізікі, фізіялогіі чалавека і жывёл, сучаснай беларускай мовы, беларускай літаратуры XX стагоддзя, рускай літаратуры, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, рускай мовы, сацыялогіі журналістыкі, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, крымінальнага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, крыміналістыкі, эканамічных навук, эканамічнай тэорыі, міжнародных эканамічных адносін, англійскай мовы, раманскіх моў, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;
- **Старшых выкладчыкаў кафедраў:** эканамічнай геаграфіі замежных краін, геадэзіі і картаграфіі, беларускай літаратуры XX стагоддзя, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, раманскіх моў, сусветнай і айчыннай гісторыі, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці;
- **Выкладчыкаў кафедраў:** рускай літаратуры, крыміналістыкі, англійскай мовы, эканамічнай тэорыі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;
- **Асістэнтаў кафедраў:** мікрабіялогіі, генетыкі і біятэхналогіі, біяхіміі, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, Белдзяржуніверсітэт, упраўленне кадраў, т. 226-59-39.*

СПОРТПЛЯЦОЎКА

Гіравікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта на чэмпіянаце рэспублікі па доўгім цыкле зноў сталі першымі ў спаборніцтве сярод калектываў, пакінуўшы за спінай каманды Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь і Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта. Але, на жаль, на гэтым чэмпіянаце ў нас толькі адзін залаты медаль. У вагавай катэгорыі майстра спорту Дзмітрыя Баркана (да 75 кг), студэнта ФПМІ, барацьба, як і заўсёды, ішла не на жарт. Але Дзмітрый даказаў, што ён мацнейшы за сваіх сапернікаў.

Сенсацыя нарадзілася ў вазе да 80 кг. Наш майстар спорту Алесь Воўк, студэнт юрфака, пераможца мінулагодняга першынства свету, трохразовы чэмпіён рэспублікі, на гэтым чэмпіянаце быў толькі другім. Ён усяго толькі адзін пад'ём праіграў свайму таварышу па зборнай Мінска, майстру спорту Юрыю Байрамаву.

Таксама срэбраныя медалі прывезлі з першынства рэспублікі студэнт юрфака кандыдат у майстры спорту Дзмітрый Заплешнікаў (вага да 100 кг) і студэнт факультэта міжнародных адносін майстар спорту Андрэй Атрашкевіч (вага звыш 100 кг).

Ёсць і адно трэцяе месца. У вазе да 70 кг трэцім стаў член спортклуба БДУ Сяргей Наскоўскі.

***

У фае інтэрната № 5 адбылося першынство па настольным тэнісе сярод інтэрнатаў БДУ. Каманда інтэрната № 10 у складзе Д. Ушакова, В. Смірнова і Ю. Юран заняла першае месца. Другое — інтэрнат № 7 і трэцяе — інтэрнат № 2.

***

На першынстве Маскоўскага раёна па футболе зборная каманда студэнтаў Белдзяржуніверсітэта заняла другое месца. Нашы хлопцы перамаглі сваіх візаві з медыцынскага інстытута з лікам 9-2. Але самымі моцнымі аказаліся спартсмены педагагічнага універсітэта: 1-4 не на карысць каманды БДУ.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

КОНКУРСЫ

# Спяшайцеся!

Напрыканцы красавіка ў Белдзяржуніверсітэце пройдзе фестываль аўтараў і выканаўцаў аўтарскай і паэтычнай песні. Жадаючым прыняць у ім удзел раім паспяшацца, бо заяўкі прымаюцца толькі да 12 красавіка, а 15 красавіка ўжо будзе праслухоўванне. Для ўдзельнікаў конкурсу існуе толькі адна ўмова: музычны інструмент павінен быць акустычным, канкурсанты з электрычнымі музычнымі інструментамі да конкурсу не дапускаюцца.

*Вас чакаюць з заяўкамі ў дырэкцыі па справах культуры (пр. Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, тэл. 220-42-07).*

САКРЭТ ФІРМЫ

## Стыпендыі даследчыкам

Міжнародны цэнтр адукацыі разам з Нацыянальным універсітэтам Ірландыі (г. Галвей) плануе выдзеліць даследчыцкія стыпендыі на 1999/2000 акадэмічны год. Запрашаюцца спецыялісты ў галіне адукацыі, правоў чалавека, інфармацыйнай тэхналогіі, гідралогіі. Заяўкі на атрыманне стыпендый падаюцца да 30 красавіка 1999 года.

## Кангрэс па прыродазнаўчых навуках і тэхніцы

Алжырскі універсітэт навукі і тэхналогіі праводзіць 27-30 лістапада 1999 года міжнародны кангрэс па праблемах прыродазнаўчых навук і тэхнікі. Працоўнымі мовамі кангрэсу прызнаюцца арабская, французская і англійская.

## Школа аўтаматычных тэхналогій

Універсітэт у горадзе Эслінгене (Германія) арганізуе з верасня 1999 года па студзень 2000 года Школу аўтаматычных тэхналогій. Яе мэта — навучанне студэнтаў з усяго свету наладжванню сувязей паміж культурамі, а таксама знішчэнне правалаў паміж вытворчасцю і навукай. Усе выдаткі па навучанні студэнтаў бяруць на сябе ўрад і спонсары. Крайні тэрмін падачы дакументаў 15 ліпеня 1999 года.

## Амерыканская праграма

Са студзеня 2000 года па май 2001 года будзе дзейнічаць праграма ACCELS. Удзельнікамі яе могуць стаць выкладчыкі сацыяльных і гуманітарных навук, якія добра валодаюць англійскай пісьмовай і размоўнай мовай, маюць дыплом аб вышэйшай адукацыі і суправаджальны ліст ад рэктара універсітэта. На час удзелу ў амерыканскай праграме арганізатары пакрываюць выдаткі па пражыванні, стыпендыі, набыцці неабходных акадэмічных матэрыялаў, аплочваюць медыцынскую страхоўку, білеты ў абодва бакі. Крайні тэрмін падачы дакументаў 30 красавіка 1999 года.

*Дадатковую інфармацыю можна атрымаць ва ўпраўленні міжнародных сувязей па адрасе: вул. Бабруйская, 7, пакой 416, тэл. 220-88-21.*

# Каменная казка

У будынку геаграфічнага факультэта праходзіла X Міжнародная мінералагічная выстава, прысвечаная Дню геолага і 65-годдзю факультэта геаграфіі БДУ.

На выставе былі прадстаўлены калекцыі мінералаў і вырабы з іх, а таксама вырабы з прыродных матэрыялаў (дрэва, гліна), сувеніры, рэдкая літаратура пра мінералы.

Усяго ў Мінску сабралося каля 40 калекцыянераў і народных майстроў. Прычым 10 з іх не прапусцілі ніводнай выставы. Адным з пастаянных удзельнікаў з'яўляецца Калінінградскі бурштынавы камбінат. На гэты раз калекцыя бурштыну, прадстаўленая Альбертам Аляксандравічам Багданавым, пакарыла сэрцы многіх гледачоў.



Шмат каму спадабалася калекцыя берылаў, якую прывёз Валерый Выдрын з уральскага горада Асбеста. Цікавай была і заірская калекцыя малахіту і ўпрыгожанняў з яго, якая прыехала з далёкага Конга. Выстаўлялі свае калекцыі і заўсёднікі з Крывога Рога, Кіева, Харкава, Санкт-Пецярбурга, Масквы. Але ў гэтым годзе, як ніколі раней, шмат было беларускіх калекцыянераў: з Гродна, Оршы і, вядома ж, з Мінска.

Адна з мэтаў выставы — бліжэй пазнаёміць людзей з трэцім царствам прыроды. І дзеля гэтага знаёмства за тры дні геафак наведалі амаль 6 тысяч чалавек. Асабліва шмат было моладзі. Наведнікі не толькі разглядалі камяні, але і мелі магчымасць набыць упадабаныя ўпрыгожанні і нават зрабіць індывідуальны заказ. Можна было і звярнуцца да спецыялістаў. Гэта ж толькі з першага позірку здаецца, што лёгка выбраць сабе пацеркі з бурштыну альбо завушніцы з горнага крышталю. А як да справы — дык разгубіцца вельмі проста. Камяні, як і людзі, непаўторныя. І вельмі важна знайсці менавіта свой камень, які б абараняў, дапамагаў. Ні ў якім разе нельга купляць камень, які вам не вельмі падабаецца, — нават калі ўсе вучоныя кніжкі пішуць, што гэта ваш талісман. Толькі шкоды сабе наробіце. А вось калі каменьчык сам на вас "зірне", ды яшчэ і спецыялісты параяць яго набыць, тады ніякіх чорных сіл можаце не баяцца...

Арганізатары выставы імкнуцца пастаянна распавядаць пра камяні, бліжэй знаёміць з імі, з іх магчымасцямі і здольнасцямі. Бо камяні — гэта вечная прыгажосць, якая з гадамі становіцца яшчэ больш прывабнай. Археолагаў, якія праводзілі раскопкі егіпецкіх пірамід, здзівіла ззянне рубінаў і брыльянтаў. А яны ж праляжалі ў зямлі не адну тысячу год...

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

# Вечныя скарбы зямлі

Ювелірныя камяні — гэта не проста ўпрыгожанне альбо твор мастацтва, яны жывяць свайго гаспадара, але толькі пры ўмове гармоніі "біярытмаў" каменя і біярытмаў чалавека.

У музей землязнаўства наведнікі часта звяртаюцца з просьбай падабраць "свой" камень. Наш вопыт сведчыць аб наступным. Самая галоўная ўмова пры выбары каменя заключаецца ў тым, каб камень спадабаўся вам. Прыслухайцеся да свайго сэрца, паверце сваім вачам, і яны вас не падвядуць. У прыродзе няма паўтарэнняў — і людзі, і камяні розныя. Другой умовай правільнага выбару з'яўляецца ўлік шматвяковага вопыту людзей. Давайце зазірнём у таямнічую скарбонку самацветаў, дзе камяні раскладзены ў адпаведнасці з задыякальным характарам чалавека, і раскажам пра некаторыя з іх. З 21 сакавіка па 20 красавіка Сонца праходзіць праз сузор'е Аўна — першы знак Задыяка. Людзям, якія нарадзіліся пад гэтым знакам, рэкамендуецца шмат камянёў з групы кварца (аметыст, горны крышталь, онікс і інш.). Па звестках некаторых астралагічных школ, Аўнам прапануюцца самыя чырвоныя камяні (рубін, шпінель, гранат, сардонікс, чырвоная яшма). У блакітным сакавіку трэба насіць аквамарын — талісман вернага сяброўства і разважлівасці — і амазаніт, які лічыцца каменем блаславення, сімвалам прыгажосці і жаночай незалежнасці. Празрысты красавік неабыякавы да алмазаў і горнага крышталю. Май багаты ўсімі адценнямі зялёнага колеру — малахіт, хрызапраз, жадэіт, дэмантаід і, зразумела, самы зялёны і дарагі — ізумруд.



Камень красавіка — гэта і горны крышталь. Гэта чароўны камень магаў, сімвал сціпласці і цноты. Ён валодае пяшчотнасцю паветра і чысцінёй вады. Горны крышталь з'яўляецца празрыстай разнавіднасцю кварцу і таму аж да XVII стагоддзя лічыўся закамянелым лёдам. Знешне ён нагадвае шкло, а каб адрозніць натуральны камень, трэба паднесці яго да шчакі: шкло хутка сагрэецца, а крышталь адорыць прыемнай прахалодай на працяглы час.

Народы Тыбета прымянялі крыштальны шар для зажыўлення ран, таму што промні сонца, якія праходзілі праз яго, забівалі хваравтворныя бактэрыі. У музеях свету захоўваюцца празрыстыя скарбы: у Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля — знакаміты крыштальны самавар Пятра І, у Нацыянальным музеі ў Афінах — цудоўны крыштальны сасуд у выглядзе працяглай качкі, які быў вытачаны больш за 3,5 тысячы гадоў таму. У 1937 годзе амерыканскія археолагі знайшлі жаночы чэрап, выкананы з паліраванага крышталю вельмі дэталёва майстрамі майя. Унікальным помнікам з'яўляецца крыштальны сабор у горадзе Гардэн Гроў у Каліфорніі, пабудаваны на сродкі вернікаў прапаведнікам Р. Шустэрам і ацэнены ў 20 мільёнаў долараў.

Сёння горны крышталь з'яўляецца "спецыялістам" у галіне электронікі. Гэта п'езаэлектрык і стабілізатар частот. Крыштальныя пласцінкі "працуюць" у прыстасаваннях, якія перадаюць альбо запісваюць гукавыя хістанні, вымяраюць ціск, тэмпературу і г.д.

...Камень дае неабмежаваныя магчымасці ў пазнанні прыгажосці і гармоніі. Вывучайце трэцяе царства прыроды, адкрывайце для сябе новыя далягляды, напаўняйце свае сэрцы любоўю.

*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*геолаг музея землязнаўства БДУ*

# ПАДАРОЖЖА

Сонечным ліпеньскім ранкам 1825 года на Графскай прыстані Севастопаля высадзілася зусім графская кампанія, што прыехала з Адэсы: граф Віт (генерал, шэф тайнай паліцыі Наваросіі і Таўрыды), графіня Караліна Сабанская (прыгажуня, палюбоўніца і паведамляльніца Віта), граф Сабанскі (стары і адрынуты фіктыўны муж Караліны, спекулянт пшаніцай), граф Генрык Ржавускі (брат Караліны, польскі магнат з галавы да пятак), "энтамолаг-аматар матылькоў" Башняк (палкоўнік тайнай паліцыі з Пецярбурга, які па-майстэрску вылоўліваў розных "букашак", годам пазней ён высачыў Пушкіна ў сяле Міхайлаўскім на Пскоўшчыне) і Адам Міцкевіч — сын беднага местачковага адваката, які нарадзіўся на хутары недалёка ад Навагрудка. Як трапіў гэты не вельмі свецкага выгляду 26-гадовы хлапец у гэтую вытанчаную, фарсістую кампанію?

...Адам Міцкевіч, адзін з кіраўнікоў тайнага студэнцкага таварыства філаматаў і кіраўнік секцыі літаратуры і маральных навук Віленскага універсітэта (1817-1823), у 1823 годзе быў арыштаваны, вясной наступнага года быў адпушчаны з турмы на парукі, а позняй восенню назаўсёды пакінуў родную Беларусь. Ён быў адпраўлены ў Пецярбург, дзе воляю цара быў вызначаны яго далейшы лёс.

Рускія паэты-дзекабрысты Кандрат Рылееў і Аляксандр Бястужаў зрабілі ўсё, каб Адама не выслалі ў Сібір і не загналі куды-небудзь на поўнач, а паслалі ў цёплыя паўднёвыя краі. У сакавіку 1825 года Міцкевіч апынуўся ў Адэсе. Рэкамендацыйныя лісты Рылеева і Бястужава дапамаглі яму ўвайсці ў кола адэскай знаці...

Тут, у Адэсе, свецкая дама Караліна Сабанская трымала літаратурны салон, які наведвалі еўрапейскія славутасці. У час кішынёўскай ссылкі ёю захапляўся Пушкін. І такая асоба, як Адам Міцкевіч, папросту не магла прамінуць па-за ўвагай гэтай жанчыны. На той час ён быў вядомы як аўтар балады "Свіцязянка" і паэмы "Гражына", выдадзеных у Вільні ў 1822 годзе. Паэт быў прыняты ў салон Сабанскай-Ржавускай.



В. Ваньковіч. **Міцкевіч на скале Аю-Даг.** 1828

Віт, канешне, здагадваўся, чым дыхае гэты ссыльны паэт — тайная паліцыя Адэсы трывожылася нездарма. І таму Сабанская, паводле яго загаду, усё больш і больш займалася Міцкевічам. І не толькі падчас гутарак у сваім салоне...

Вельмі прыгожая, літаратурна і музычна адораная, адукаваная жанчына, яна была шчырым агентам III Аддзялення і знаходзілася ў ліставанні з Бенкендорфам. Міцкевіч захапіўся ёю, і гэта знайшло адлюстраванне ў яго лірыцы...

Аднак Міцкевіч разгадаў падступную гульню Караліны і яе кампаньёнаў — Віта і Башняка. Гэта было не складана, бо тое-сёе падказаў граф Машынскі — прадвадзіцель дваранства Валынскай губерні, член польскага таемнага нацыянальна-патрыятычнага таварыства, добра знаёмы з Пестэлем, Рылеевым і Бястужавым. У сваіх справаздачах Віту Сабанская так і не змагла (ці не захацела) расказаць што-небудзь аб "крамольных паводзінах" паэта. Міцкевіч аказаўся па-за падазрэннямі. Напярэдадні 1826 года ён апынуўся ў Маскве і праз месяц быў залічаны ў канцылярыю генерал-губернатара, фактычна не выконваючы ніякіх службовых абавязкаў.

Ліпеньскае падарожжа закончылася бліскучым цыклам вершаў "Крымскія санеты" — шэдэўрам сусветнай паэзіі. Яны выйшлі ў 1826 годзе з прысвячэннем... "спадарожнікам вандроўкі па Крыме". Але чаму паэт прысвяціў жамчужыну сваёй творчасці сваім сышчыкам? Адказ просты — эпіграфам кнігі служаць вядомыя радкі Гётэ: "Хочаш ведаць ты паэта, дык у край яго адпраўся".

Міцкевіч імчыцца на кані да Аю-Дага па тых жа сцяжынах, якія пяць гадоў таму вялі вальнадумца Пушкіна да Гурзуфа. Адкрыта прысвяціць яму "Крымскія санеты" Міцкевіч не можа (цэнзура не прапусціць), а эпіграф з Гётэ — вось душэўнае прысвячэнне Пушкіну, такому ж царскаму ссыльнаму, як і ён сам.

Рамантыка Крыма і экзотыка Усходу натхнілі Пушкіна. У крымскіх элегіях і паэме "Бахчысарайскі фантан" ён стварыў вобраз рамантычнага паэта, які жыве ў свеце ўзвышанай любові і легенды. Такім жа быў і Міцкевіч. Вершы аб Бахчысараі, народжаныя натхненнем рускага і польска-беларускага паэта, прынеслі Хан-Сараю сапраўды сусветную славу...

Летам 1826 года Міцкевіч увайшоў у маскоўскія літаратурныя колы. Усе хутка палюбілі яго як чалавека, які прывабліваў сваёй адукаванасцю, узвышаным розумам, ветлівасцю і цудоўнай знешнасцю. Ён добра валодаў французскай, свабодна размаўляў па-нямецку, па-англійску, па-італьянску, па-іспанску і па-грэчаску. Добра ведаў латынь і, здаецца, усходнія мовы, а з'явіўшыся ў Расіі, у хуткім часе гаварыў па-руску без акцэнта. Начытанасць яго проста здзіўляла. Ён быў паўсюль дарэчы: і за вясёлым сяброўскім абедам, і ў салоне адукаванай жанчыны...

"Крымскія санеты" імгненна пераказаў прозай і выдаў падрадкоўнікам паэт і князь Пётр Вяземскі, а вершаваны варыянт зрабіў сляпы паэт з абліччам апостала Іван Казлоў. У тым жа годзе ў Маскоўскай універсітэцкай друкарні санеты пабачылі свет. У Маскве і Пецярбургу яны разышліся за адзін тыдзень, у Кіеве і Харкаве — таксама. Папулярнасць "Крымскіх санетаў" у Расіі была выключнай, і нават пазней іх перакладалі на рускую мову Міхаіл Лермантаў, Апалон Майкаў, Афанасій Фет, Іван Бунін.

У тым жа годзе адбылося доўгачаканае знаёмства Пушкіна і Міцкевіча. Рускага паэта вярнулі з ссылкі і дазволілі

# ПА КРЫМЕ

жыць у абедзвюх сталіцах. На адным з літаратурных вечароў у Венявіцінавых ён чытаў урыўкі з "Барыса Гадунова". Гэта быў час найбольшай славы цудатворца і чарадзея Пушкіна.

Міцкевіч быў здзіўлены незвычайнай лёгкасцю пушкінскага верша, а высокая паэзія Міцкевіча зачаравала і пакарыла Пушкіна. Яны сталі сябрамі. Часта ўспаміналі Крым. У часы сяброўскіх гутарак Пушкін, які працаваў у Маскве над "Барысам Гадуновым", слухаў парады Міцкевіча. Дзякуючы гэтаму яму ўдалося дакладна перадаць атмасферу, якая атачала Дзмітрыя Самазванца.

А Міцкевіча цікавіла думка Пушкіна аб беларускім народзе. Які след пакінуў беларускі край у душы рускага паэта, якія думкі і пачуцці? Двойчы пушкінскія шляхі праходзілі праз Беларусь: Полацк, Віцебск, Орша, Магілёў... Першы раз ён праязджаў па беларускіх дарогах у маі 1820 года, калі ехаў у ссылку ў Крым. У жніўні 1824 года ён другі раз праязджаў праз Беларусь: на гэты раз на поўнач, у новую ссылку — Міхайлаўскае. Абодва разы пашанцавала з надвор'ем. Пушкін з захапленнем распавядаў Міцкевічу пра тое, як у жніўні даспявалі яблыкі ў садах, пра паштовыя станцыі, цэрквы і хаты, пра беларускую карчму, пра сялянак на палях, пра тое, як пераплываў Дзвіну і Дняпро на паромах, а паміж Віцебскам і Оршай прыглянулася яму рэчка з дзіўнай назвай Лучоса...

Пушкін прызнаў вартасці Міцкевіча пры першым жа знаёмстве і заўжды выказваў яму вялікую павагу. Міцкевіч заўсёды выказваў арыгінальную думку. Неяк пры ім нехта пачаў зважаць на слабыя бакі творчасці Пушкіна і звярнуўся да Міцкевіча, чакаючы пацвярджэння гэтай думкі. Міцкевіч адказаў: "Пушкін — першы паэт свайго народа: вось што дае яму права на славу".

Напярэдадні ад'езду Міцкевіча з Масквы ў Пецярбург увесну 1828 года рускія паэты наладзілі ў яго гонар развітальную вячэру і прынеслі ў дарунак срэбраны вызалачаны кубак з выразанымі подпісамі. Міцкевіч у адказ пафранцузску імправізаваў: у вобразе Гамера ён апісаў падарожніка, які гіне ў чужым краі, не маючы з сабой нічога, апроч кубка. З Масквы ён паехаў не без шкадавання...

Жыццё Пушкіна і Міцкевіча ў Пецярбургу — росквіт іх сяброўства. Яны былі частымі гасцямі ў доме цудоўнай польскай піяністкі Марыі Шыманоўскай і яе дачок Алены і Цэліны. У музычным салоне Шыманоўскіх бывалі У. Жукоўскі, П. Вяземскі, А. Грыбаедаў, мастакі з Беларусі Аляксандр Арлоўскі, Іосіф Аляшкевіч і Валенцій Ваньковіч. У атмасферы руска-польскага ўзаемаразумення, якое гаспадарыла ў доме Шыманоўскіх, Ваньковіч напісаў партрэт Пушкіна алоўкам і, мабыць, самае значнае сваё палатно "Міцкевіч на скале Аю-Даг" — крымскі партрэт Міцкевіча, апранутага ў чаркескую бурку.

Сяброўства двух вялікіх славянскіх паэтаў, амаль пагодкаў (Пушкін быў амаль на паўгода маладзейшы), магло стаць важнай падзеяй у гісторыі польска-рускіх адносінаў. Але гістарычныя абставіны склаліся іначай. У маі 1829 года Міцкевіч, адпраўляючыся ў эміграцыю, назаўжды пакінуў Расію і сваю Беларусь. Ён адплыў першым караблём, які адпраўляўся з Кранштата ў Парыж. Выехаў спехам: паліцыя атрымала загад забраць у яго пашпарт і затрымаць у Пецярбургу "да далейшых распараджэнняў".

Пушкін развітаўся з Міцкевічам назаўжды. Два паэты не знайшлі слоў, здольных выказаць іх пачуцці. Аб развітанні Пушкіна і Міцкевіча Герцэн пазней напіша: "Яны працягнулі адзін аднаму рукі, як на магілках. Над іх галовамі грымела навальніца..."

Гэтай навальніцай было паўстанне 1830 года на тэрыторыі Польшчы і Беларусі. Гэтую падзею Пушкін разглядаў у кантэксце вялікай ролі Расіі ў лёсе Еўропы. Так і ўзнік вядомы "антыпольскі" верш "Барадзінская гадавіна"...

А палітычны эмігрант Адам Міцкевіч у 1830-х гадах актыўна выступае супраць царскага ўрада, выдае зборнік "Пецярбург" з сямі вершаў, у адным з якіх дакарае "рускіх сяброў" за тое, што яны прадалі за царскую ласку вольную душу і адрынулі пакуты сяброў.

Пушкін атрымаў гэты зборнік з Парыжа ў ліпені 1833 года і пераклаў з яго прозай тры вершы — "Рускім сябрам", "Аляшкевіч" і "Помнік Пятру Вялікаму". На крыўду ў вершах Міцкевіча ён нічым не адказаў. І нават працягваў перакладаць па-руску балады польскага паэта.

Рэакцыя Пушкіна на паўстанне была тыповай і натуральнай для прадстаўнікоў нацыянальна-дзяржаўнага светапогляду. Разгром еўрапейскіх рэвалюцый (неапалітанскай, іспанскай, французскай) пераканаў яго, што вызваленне народаў — справа аддаленай будучыні. А Міцкевіч бачыў будучыню славян у іх аб'яднанні на грунце рэспубліканскай дэмакратыі. Стаўленне Пушкіна і Міцкевіча да "польскага пытання" не разбурыла, а толькі ўскладніла іх сяброўства. Будучыня пакажа, што яны не зразумелі адзін аднаго. Але на асабістай глебе яны захоўвалі адзін да аднаго цёплыя пачуцці.

Глыбокае шанаванне Міцкевіча-паэта прысутнічала ў Пушкіна заўсёды: ён ставіў яго ў адзін шэраг з Дантэ, Петраркам і Камоэнсам. А Міцкевіч нідзе і ніколі не адгукнуўся на антыпольскія вершы Пушкіна. Ён высока цаніў яго паэзію, што пацвердзіў у артыкуле памяці



І. Айвазоўскі, І. Рэпін. **Развітанне Пушкіна з морам.** 1887

Пушкіна ў французскай газеце "Le Globe" (1837), падпісаным "Сябар Пушкіна", і ў сваіх лекцыях аб славянскіх літаратурах у Калеж дэ Франс у Парыжы.

Паэтычны дар двух славянскіх паэтаў асвяціў XIX стагоддзе і працягвае нязгасна ззяць на парозе новага, XXI стагоддзя.

*Валерый ЯРМОЛЕНКА,*
*доктар геаграфічных навук*

# ВЕСНАВОЕ...

*(З нагоды прыходу ў літаратуру новага пачынаючага таленту)*

Блаславёна тая хвіліна, калі ты застаешся сам-насам з кнігай, за добрым чытаннем. А калі яшчэ гэта студэнцкія вершы паэта ці паэткі...

Пачынаючы чытаць хвалюючыя вершаваныя радкі, нечакана злавіў сябе на думцы, што я нават не памятаю гэтай студэнткі. Якая яна? Высокая, стройная, як таполя, гнуткая, як прыбярэжная асака, альбо малюпасенькая ці рухавая, як яшчарка ў пушчанскім верасовым гушчары?..

...Яна падбегла да мяне пасля лекцый, на якой я расказваў студэнтам пра беларускую літаратуру ў свеце. Не, нават не падбегла, а ціхмяна неяк аддзялілася ад натоўпу студэнтаў, збочыла, нібы незнарок, аддала сшытак з вершамі і зноўку злілася з вірлівай студэнцкай плынню, што выплёсквалася з дзвярэй аўдыторыі, расцякалася па лесвіцах. Яна аддала свой сшытак неяк незаўважна.

— Тут мае вершы, — толькі і сказала яна ціха на развітанне.

Мне тады падалося, што гэта не сама яна, студэнтка, пакінула свае вершы, а нейкая нябачная і ціўклівая птушачка з паднябесся апусцілася сюды, ва універсітэцкую аўдыторыю, каб пакласці на стол сшытачак з вершамі, дзе занатаваны радкі растрывожанага вяснаной дзявочага сэрца.

Што мне рабіць з гэтым паэтычным скарбам? У тое імгненне я нават не ведаў, чаго чакаюць ад мяне — ухвалы, рэцэнзіі, благаславення, водгуку, дапамогі? Калі ж надвячоркам таго самага дня дома я пачаў чытаць тыя вершы, яны адразу забралі мяне ў свой палон. Я ўжо ведаў, што буду рабіць з гэтымі мастацкімі творамі.

Іх трэба прадставіць чытачам. Найперш нашым універсітэцкім студэнтам. Але мне патрэбна было больш ведаць пра саму студэнтку. Таму на наступнай лекцыі для студэнтаў І курса аддзялення замежных моў і літаратур філалагічнага факультэта я выклікаў студэнтку афіцыйна:

— Галаванава, Мая...

Паднялася са свайго месца дзесьці з перадапошніх радоў найвышэйшага яруса і падбегла да кафедры высокая і ўсмешлівая дзяўчына з адкрытым і спакойным паглядам, круглатварая, з выразнымі рысамі, са светлымі валасамі, з карычневымі, бы каштаны, вачыма.

— Друкуйце. Праўце мае вершы, — дала яна згоду.

Яна паабяцала прынесці фотаздымак для газеты і напісаць нешта пра сябе...

Прайшоў яшчэ тыдзень, і мне падумалася, што найлепш пра яе саму могуць расказаць уласныя творы. Яна так і пасаромелася нешта пісаць пра сябе... Якая яшчэ біяграфія ў студэнта?

Няхай за студэнтку гавораць сёння самі вершы. Адно магу зазначыць. Заўсёды праяўляў недавер да вершаў маладых з налётам "сусветнай тугі", калі ў іх гучаў "усяленскі боль", гучала "сусветнае расчараванне". І гэта пасля лермантаўскай і пушкінскай паэзіі... Аднойчы пасля такіх вершаў, дасланых у сталічны рускі часопіс "Жизнь для всех", паэт-пачатковец К.К. Атраховіч (Кандрат Крапіва), атрымаўшы адмоўны адказ, на восем гадоў замоўк і думаў, што перастаў займацца паэзіяй наогул.



Тут жа, у студэнцкіх вершах, жыло трапяткое і непадробнае пачуццё. Чуецца мелодыя душы, адчуваецца біццё растрывожанага сэрца, якое тахкае ў сваім, толькі яму ўласцівым рытме, з невыказанай да канца трывогай, у якой адбіваюцца час і людзі, наш век. У гэтых вершаваных радках не зблытаеш, што яны напісаны ў канцы нашага тэхнагеннага і трывожнага агнявога дваццатага стагоддзя. Таго стагоддзя, што прайшло пад знакам любові, пажару і чорнага сонца. Пад знакам чорнага дыска сонца, якое бачыць шолахаўскі герой "Ціхага Дона" пры развітанні з каханай, склаўшы на яе грудзях у магіле па-мярцвячаму бледныя рукі. Хто ведае, з чым мы развітваемся ў дваццатым стагоддзі?..

У вершах юнай паэтэсы няма, здавалася б, таго выбуховага рэчыва, якое нараджае безвыходнасць, няма надлому, тугі і невылечнага болю, няма трагедыйнасці. У іх адбіліся гукі, народжаныя адкрыццём самой сабе, чаканнем, калі загучалі напятыя струны душы, складваючыся ў стройную мелодыю веснавога пачуцця, веснавога сэрца, мелодыку юнай студэнцкай душы, якая настроена на самае запаветнае і самае сакраментальнае. Паслухаем...

*Уладзімір НАВУМОВІЧ,*
*загадчык кафедры беларусазнаўства БДУ, пісьменнік*

## Мая ГАЛАВАНАВА

***

Чагосьці не хапае для кахання...
Прыгожых слоў пад ніцаю вярбой?
Дакучлівых дарэмных абяцанняў
Заўжды і ўсюды быць з адным табой?
Абрыдзела чакаць цябе бясконца,
Глядзець таемна ў вочы і маўчаць,
Абрыдзела тваё сляпое сонца,
Што смее мне каханне засланяць.
Не трэба безнадзейных намаганняў,
Не чутны нашы словы той вярбе...
Чагосьці не хапае для кахання...
Як проста! — Не хапае мне... цябе.

*15.08.98 г.*

***

Абяцанні... Ізноў абяцанні
Напаўняюць пустыя мяхі тваіх слоў...
Толькі моцнае ные жаданне —
Усё забыць і вярнуцца дамоў
Да бацькоў... Яны сцерпяць і здраду
Ранняй птушкі, загубіўшай жыццё,
Што ўзляцела ад роднага саду,
Улюблёная ў небыццё.
Але час усё развеяў па свеце:
І любоў, і нянавісць... Ізноў
Зацыроўваю старыя раны
На душы ад тваіх "вешчых" слоў...

*14.06.98 г.*

***

Я шукаю ні дна, ні бяздоння,
Ні святла ў паўночнай глушы,
Я шукаю цябе на далоні
Бездагляднай, бясконцай шашы.
Я іду і падлічваю крокі
Да цябе, мая мара, мой сон,
Я шукаю дзве нашыя зоркі,
Асвяціць каб дарогі далонь.
Я лячу ў прадонне паветра
За табой над лясістым каўнерам зямлі...
На мінулым маім стаіць строгае "вета",
Я шукаю цябе... Дзе ж ты?

*8.06.98 г.*

# "ЛіМузІн"

Крыху больш за месяц прамінула з таго часу, як было створана творчае аб'яднанне "ЛіМузІн" (Літаратурна-музычная ініцыятыва). Дырэкцыя па справах культуры БДУ актыўна падтрымала ідэю студэнта 4-га курса мехмата Аляксандра Аўдзеюка і клапатліва ўзялася апякаць нованароджанае аб'яднанне, прадаставіўшы яму памяшканне.

У наш час мноства маладых дзяўчат і хлопцаў, якія любяць творчасць і захапляюцца музыкай, тэатрам, паэзіяй, папросту не знаходзяць аднадумцаў, у кампаніі якіх яны пачуваліся б нязмушана. У нас вы можаце свабодна прачытаць свае вершы ці апавяданні і пабачыць рэакцыю на іх, можаце сыграць і праспяваць свае песні, а можаце проста пасядзець і ўсё гэта паслухаць. Мы заўжды рады ўсім наведнікам. І да таго ж мы ніколі і нікому не навязваем якіх-небудзь палітычных перакананняў і поглядаў.

Зрэшты, калі вы хочаце самі разабрацца, што ж уяўляе з сябе нашае аб'яднанне, заходзьце як-небудзь у сераду а сёмай гадзіне вечара ў галоўны корпус БДУ. Вы лёгка знойдзеце нас, падняўшыся на другі паверх.

*Андрэй ГІВОЙНА,*
*Аляксандр АЎДЗЯЮК*

*Андрэй Гівойна — студэнт 5-га курса геаграфічнага факультэта БДУ. Член Беларускай лігі інтэлектуальных каманд.*

*Пісаць пачаў пяць гадоў таму. Да творчасці ставіцца легкадумна, але з разуменнем. Сярод захапленняў — інтэлектуальныя гульні кшталту "Што? Дзе? Калі?", геаграфія, футбол, футбол, футбол, дзяўчаты, камп'ютэр, зносіны з цікавымі людзьмі.*

*Пра сябе кажа: "Ігрок і актор па жыцці". Пазбаўлены згрызотаў сумлення пры зносінах з асобамі супрацьлеглага полу.*

*Адзін з заснавальнікаў ТА "ЛіМузІн" пры БДУ. Ігрок каманды "МахМед" па інтэлектуальных гульнях.*

## Андрэй ГІВОЙНА

### Слова

Как много слов на свете —
и ласковых, и грубых,
И каждый день мы слышим
их тысячами вновь.
Но никогда на свете
мы не забудем губы
Те, что шептали нежно
про ласку и любовь.

И губы те пылали, как солнце
в час заката,
И глаз аквамарины
влекли нас в бездну снов,
И верили тогда мы,
что никакой расплаты
Не будет нам за это
нагроможденье слов.

Но проходили годы,
мы слышали все то же,
И говорили так же "Люблю!",
но уж другим.
Так почему же нынче
все чаще и все строже
Нам снятся губы первой,
далекой уж любви?

О, те слова смешные,
что мы с трудом искали,
Порой произнося вас
не так и невпопад,
Неужто вы избились,
неужто ложью стали,
И вам неужто больше
никто не будет рад?!

***

Давай поговорим о вечном —
О счастье, о любви и вере...
И встретимся давай на Млечном,
Я, как всегда, приду первым.

Я, как всегда, приду первым,
Улыбкою тебя встречу,
Щеки твоей коснусь нервно
И обниму твои плечи.

И обниму твои плечи,
И этот внеземной разум
В глазах твоих зажжет свечи,
Которые пленят сразу.

Которые пленят сразу,
Я не успею все взвесить,
И даже не моргну глазом,
Как угожу в твои сети.

Как угожу в твои сети,
Ты губ моих коснешься нежно...
И тихо пропоет ветер:
"Давай поговорим о вечном"...



# "...Публике смотреть воспрещается"



27 сакавіка прайшоў Міжнародны дзень тэатра. І менавіта ў гэты дзень адбылася прэм'ера спектакля "Дамы и господа... или Публике смотреть воспрещается" па п'есе Жана Марсана, рэжысёрам-пастаноўшчыкам якой стаў Сяргей Турбан. Студэнцкаму тэатру БДУ ўжо больш за 50 гадоў. Колькі талентаў грала ў яго сценах на працягу гэтага часу! Сёння ж мы былі сведкамі другога нараджэння Студэнцкага тэатра. "На балконе" — ягоная назва і цяперашняе месцазнаходжанне, гэта значыць — на балконе актавай залы галоўнага навучальнага корпуса БДУ.

Але вернемся да самога спектакля. З абсалютнай упэўненасцю можна сказаць, што ён быў надзвычайны: захапляльная пастаноўка з тонкім гумарам; майстэрская ігра акцёраў (няхай пакуль не прафесійных, але затое яны глыбока адчуваюць сваіх персанажаў); цікавыя дэкарацыі; цудоўныя касцюмы і, што самае галоўнае, цёплая абстаноўка. Асабліва хочацца адзначыць такіх яркіх акцёраў, як Людміла Боўбель, Ягор Найдовіч, Уладзімір Язылец, Святлана Латышава. Брава! Прыемнае ўражанне пакінулі М. Дубовік, М. Крываногава, В. Навуменка, К. Папяляева, Д. Рой. Малайцы!

Але без рэжысёра, як і без дырыжора ў аркестры, тэатра няма. Сяргей Турбан — галоўны рэжысёр Дырэкцыі па справах культуры БДУ і сёння мастацкі кіраўнік тэатра "На балконе". Аб яго высокім майстэрстве мы можаце меркаваць па наступных пастаноўках: "Цар Максімільян" — спектакль, які двойчы быў паказаны ў тэатры імя Янкі Купалы і прайшоў з аншлагам; шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных 75-годдзю БДУ; "Міс Універсітэт-98"; "Дзень ведаў" — свята, якое праходзіла 1 верасня мінулага года на плошчы Незалежнасці, і нарэшце, уся серыя гульняў камандаў КВЗ БДУ.

Нельга абмінуць увагай майстэрскую работу пастановачнай групы спектакля: мастака С. Кармазіна, балетмайстра Н. Янушкевіч, музычнага афарміцеля С. Кулікоўскага, асвятляльніка А. Сёмухі, гукавога афармляльніка А. Ганчарова, касцюмера І. Бародзіч, памочніка рэжысёра А. Паможнага, загадчыка пастановачнай часткай Э. Анісенкі, мастака-дызайнера С. Дугіна.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і перашкоды, прэм'ера адбылася, а значыць, Студэнцкаму тэатру "На балконе" — жыць. Дык у добры шлях!

*Кацярына САЛАДУХА,*
*інспектар упраўлення выхаваўчай працы з моладдзю*

# ХТО ВЫ: ЛЕТА ЦІ ЗІМА?



Натуральна, што з надыходам вясны жанчыны асабліва адчуваюць патрэбу выглядаць больш прывабна. Вельмі добра, калі ў вас ёсць густ, калі вы самі можаце падабраць касметыку, ведаеце, як правільна сачыць за сабой і г.д. Але бывае так, што жанчына глядзіцца ў люстэрка, і на першы погляд нібыта ўсё ідэальна: дарагая сукенка, прычоска, макіяж, але нешта ўсё роўна не падабаецца, а што — цяжка зразумець. У такіх выпадках неабходна звярнуцца па параду да спецыяліста. І далёка хадзіць не трэба. У інтэрнаце БДУ № 4, што знаходзіцца на праспекце Машэрава, 9 (тэл. 226-98-52), ужо даўно працуе касметычны салон "Маленькі дом". Гаспадыня салона Алена Іванаўна Бараноўская расказала карэспандэнту "Беларускага універсітэта", што ў "Маленькім доме" можна знайсці шырокі комплекс паслуг касметолага, візажыста, масажыста, нават псіхолага. Акрамя таго, ужо некалькі разоў сумесна са студэнцкім гарадком БДУ ладзіліся бясплатныя лекцыі для студэнтаў. І самае важнае, што для студэнтаў БДУ цэны ў салоне зніжаны на 30 %, а для супрацоўнікаў БДУ — на 10 %.

*На гэты раз мы вырашылі пазнаёміць чытачоў "Беларускага універсітэта" з візажыстам салона Марыяй Канстанцінаўнай Чарняцовай.*

**— Марыя Канстанцінаўна, скажыце, калі ласка, ці можа маладая дзяўчына добра выглядаць без касметыкі?**

— Канешне, можа, але, на маю думку, касметыка неабходна не толькі для таго, каб падкрэсліць нейкія рысы твару, адчуваць сябе больш прывабна і ўпэнена. Касметыка ў першую чаргу патрэбна для таго, каб абараніць наш твар ад пылу, бруду, сонца і г. д. Асабліва важна правільна карыстацца штодзённымі ахоўнымі крэмамі, крэмамі-пудрамі. Неабходна звяртаць увагу на якасць гэтай касметыкі, каб не нашкодзіць сабе, а таксама, каб крэм гарманічна спалучаўся з колерам вашай скуры. Акрамя таго, трэба ўлічваць пару сутак: дзённы макіяж зусім адрозніваецца ад вячэрняга.

**— А якім чынам вы дапамагаеце падабраць касметыку?**

— Перш за ўсё я імкнуся вызначыць, да якога тыпу адносіцца чалавек. Хто ён: зіма, лета, восень ці вясна? Існуе даволі распаўсюджаная амерыканская сістэма, па якой гэта можна зрабіць. Я ўжо даўно захапляюся каларыстыкай — так называецца падраздзел навукі аб іміджы. Але самому чалавеку, нават з дапамогай кніжак, сябровак і методык, цяжка вызначыць свой тып. Мне здаецца, я адчуваю колер. Гэта вельмі важна, каб удала падабраць пэўныя гамы колераў і параіць сваім кліентам нешта канкрэтнае. Напрыклад, я адразу вызначыла, што вы — лета. Калі казаць у двух словах, вам будуць больш пасаваць колеры няяркіх, прыглушаных, халодных таноў. Такія, як блакітнавата-шэры, фіялетавы, адценні ружовага, сіняга, шаравата-бэжавага і інш. Але яркія, насычаныя аранжавы, зялёны, карычневы — не для вас.

Аднойчы ў мяне быў выпадак. Прыйшла дзяўчына і пачала скардзіцца, што не можа пазбавіцца сінякоў пад вачыма. Мы падабралі колеры, стыль макіяжу, паказалі, як правільна карыстацца касметыкай. І сінякі зніклі самі сабой — дзяўчына проста няўдала фарбавала вочы. Так што ўсіх, каму нешта не падабаецца ў сабе, хто хоча вызначыць свой стыль, ведаць свае найбольш удалыя колеры, навучыцца правільна рабіць макіяж, мы чакаем у "Маленькім доме".

*Таццяна КУХАРЧУК*



# ЗАЛОГ ПОСПЕХУ — "ЧЫРВОНЫ" ДЫПЛОМ І ЧОРНЫ ПОЯС

Пачытаўшы аб'яву аб курсах інтэлектуальнай (!) самаабароны пры БДУ, мы далі волю фантазіі і ўявілі сабе гэткіх монстрыкаў з антэнамі, якія даюць устаноўку "на ўвагу".

Але ўсё аказалася не так страшна. Інтэлект інтэлектам, а стары добры "справа ў сківіцу" яшчэ нікога не падводзіў. Проста неабходна вельмі шчыльнае ўзаемадзеянне эфемерных імпульсаў мозгу і грубай фізічнай сілы. Інакш кажучы, перш чым стукнуць — думай, галава, думай.

Вучыць студэнтаў, аспірантаў быць заўсёды гатовымі даць адпор... не здзіўляйся — кандыдат тэхнічных навук і каратыст са стажам Валянцін Іванавіч Ярмалінскі. Заснаваны курсы кафедрай фізвыхавання і ёю ж фінансуюцца. Таму яны бясплатныя для наведвальнікаў, але ад гэтага не менш карысныя.

Курс навучання на 70 % складаецца з практычнай падрыхтоўкі і на 30 % — з тэарэтычнай. Практыка (яна ж фізічная падрыхтоўка) заснавана на сістэме традыцыйнага каратэ, эфектыўнасць якога пацверджана многімі амерыканскімі баевікамі.

Але, на думку Валянціна Іванавіча, куды больш важна ўмець не давесці канфлікт да звыклай бойкі, а то і наогул пагасіць яго на самым пачатку. 95 % канфліктных сітуацый можна пазбегнуць, калі ведаць, як гэта правільна зрабіць. Каб даведацца пра гэта, мы пабылі на адным з семінараў, прысвечаным розным узроўням небяспекі. Аказваецца, самую сур'ёзную пагрозу ўяўляюць стыхійныя бедствы (зрэшты, яны рэдка наведваюць Беларусь), а таксама арганізаваная злачыннасць (на шчасце, беднае студэнцтва яе цікавіць мала). Ва ўсіх іншых выпадках можна паспрабаваць паўплываць на сітуацыю і змяніць яе на сваю карысць.

Перш-наперш трэба паспрабаваць завесці дыялог. Адной хвіліны гутаркі дастаткова, каб згас напал эмоцый, дый студэнт будзе адчуваць сябе куды больш упэўнена ў размове, чым у бойцы. А што далей? Напрыклад, у знаёмай некаторым сітуацыі "Грошы на бочку" можна:

а) са справядлівым абурэннем заявіць: "Ды ў вас што, суботнік сёння?! Пяты раз спыняюць, кашалёк патрабуюць!" — і сумленна працягнуць пустую ёмістасць для грошай. Грошы, канешне, трэба дастаць загадзя і несці... ну, хаця б пад сцілкай;

б) пусціць слязу, разжаліць, падкрэсліць сваю нікчэмнасць, сіратлівасць і ўбогасць. "І самі мы не тутэйшыя..." — магчыма, дагоняць і грошай дадуць альбо булачку з макам;

в) усклікнуць: "Ой, а што ў цябе з вухам (носам, вокам)? Я медык, між іншым, дык вось, гэта — сібірская язва (чорная воспа, белая гарачка)!"

Магчымы і іншыя варыянты ў залежнасці ад сітуацыі, палёту фантазіі і сацыяльнага статусу нападаючага. Затое ёсць рэчы, якія не трэба рабіць ні ў якім выпадку: крычаць, пагражаць, спрачацца, актыўна жэстыкуляваць, рабіць з'едлівыя заўвагі.

Замах на кашалёк — толькі адна з магчымых непрыемнасцей, якія чакаюць нас штодня.



Праблемныя сітуацыі могуць узнікнуць на кожным кроку: у машыне, у ліфце, на будоўлі, у завулку, на пустым месцы... Тонкасці паводзін у такіх сітуацыях разгледзець, канешне, нельга, але даць хаця б агульнае ўяўленне — неабходна. Таму прыходзьце, слухайце. А ўжо калі вам не ўдалося засцерагчыся ад небяспекі і бойка вось-вось пачнецца — сканцэтруйцеся, цвяроза ацаніце абставіны і выберыце найлепшы спосаб абароны (глядзіце фота). І памятайце: "Калі ён мяне прыкончыць матам, я яго праз бядро з захопам альбо ход канём па галаве".

*Вольга ЛОЙКА,*
*Вікторыя ЦЕЛЯШУК*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

*Ум. друк. арк. 1*

*Падпісана ў друк у 12.00*

*8 КРАСАВІКА*
*Зак. 277.*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

**Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка П. Крышаловіча*